## ВАРЫЯЦЫІ



СВЯТЛАНЫ ГУТКОЎСКАЙ

У наш час актуальна і модна аб'ядноўвацца. І прыклады — на кожным кроку: ад палітыка-эканамічных саюзаў да сцэнічных твораў сінтэтычнага характару. З'яднанне ў адным мастацкім прадукце сродкаў і прыёмаў розных відаў творчасці, — патрэба часу. Аднак што мы набываем і што губляем, калі размова ідзе пра харэаграфію?

Шлях, які прайшла харэаграфічная мініяцюра, вялікі. Вобразнасць, метафарычная шматзначнасць — гэтыя прыкметы танца ў канцы мінулага стагоддзя былі шматкроць узмоцнены пастаноўшчыкамі нумароў. «Баль правіла» музычна-тэатральная прырода пластыкі. Вобразнасць была яе сутнасцю, і цяжка змірыцца з думкай, што мініяцюра як *самакаштоўны твор* паступова памірае.

Сёння на сцэне запатрабавана толькі так званая «антуражная харэаграфія» (або падтанцоўка вакалісту), якой адведзена зневажальная роля другога плану. Але ж сцэнічны танец — гэта не набор эфектных рухаў! Гэта аўтарскі тэкст, лагічна пабудаваны балетмайстрам, які перадае індывідуальнае ўспрыманне музыкі і ў саюзе з ёй стварае вобразную сістэму. Цяпер пастаноўшчыкі такіх падтанцовак часцей выкарыстоўваюць апрабаваныя эпатажныя прыёмы і лексічныя знаходкі з ужо створанага і ўбачанага (перадусім — у замежных творцаў), чым шукаюць свае і арыгінальнае. Так, танцавальная падтрымка неабходная эстрадным спевакам, бо ўзмацняе глядацкі эфект нумара ўвогуле. Але…

Ёсць і іншы бок праблемы. Як вядома, выканаўца і глядач выхоўваюць адзін аднаго. Большая частка публікі чакае трукаў, горача пляскае каскаду рухаў і тым самым заахвочвае танцораў. У адказ харэографы і артысты імкнуцца памножыць тэхнічны арсенал, забываючыся на вобразнасць, без якой ніводны твор не можа прэтэндаваць на прыналежнасць да мастацтва. Мова танца становіцца механістычнай, адбываецца нівеліроўка і харэаграфічнага почырку, і выканальніцкага стылю, у выніку спустошваецца вобразны змест нумара. Магчыма, мой непакой своечасовы, магчыма, запозненны. Але ці трэба некага пераконваць у тым, што менавіта творцы фарміруюць мастацкі густ гледачоў? ■

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ